**Экскурсія ў школьным гісторыка-краязнаўчым музеі «Спадчына» Лебедзеўскай сярэдняй школы на тэму:**

**«Пра што апавядаюць музейныя экспанаты часоў Першай сусветнай вайны?»**

Аўтар:
Апанасевіч Антон Антонавіч,
настаўнік гісторыі и грамадазнаўства
Лебедзеўскай сярэдняй школы
Маладзечанскага раёна

**Мэта** – развіццё цікавасці да гісторыі роднага краю і гісторыі Першай сусветнай вайны.

**Задачы:**

пазнаёміць са зброяй, ваенным начыннем і прадметамі быту ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны ў нашым краі;

садзейнічаць пашырэнню кругазора і пазнавальных інтарэсаў экскурсантаў;

садзейнічаць выхаванню крытычных адносін да войнаў і ваенных канфліктаў.

**Экспанаты экскурсіі:**

Паштоўка 1914 года; медны кацёл, выраблены ў 1887 годзе; мельхіоравы Георгіеўскі крыж чацвёртай ступені (1917г.) і салдацкі сярэбраны абраз; перанасны стальны шчыт нямецкіх штурмавых груп; латунная кукарда ў выглядзе выявы вялікага прускага арла; нямецкі стальны шлем узору 1916 года; расійская і нямецкая халодная зброя; асабістыя рэчы ўдзельнікаў вайны і інш.

**Тэхналагічная карта экскурсіі:**

Від экскурсіі: музейная;

Тып экскурсіі: аглядная;

Аб'ект экскурсіі: зброя, ваеннае начынне і прадметы быту ўдельнікаў Першай сусветнай вайны ў нашым краі;

Працяг экскурсіі: 45 хвілін;

Склад экскурсантаў: вучні старэйшых класаў (могуць быць настаўнікі, жыхары і госці населенага пункта).

**Меры бяспекі:**

1.Наведвальнікі музея павінны ведаць шляхі эвакуацыі з памяшкання. Для гэтага, апынуўшыся ў музеі, ім патрэбна агледзіцца і засведчыць шляхі выхаду з яго.

2. Нельга браць у рукі музейныя экспанаты. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на рэжучую і колючую зброю.

3. Нельга кранаць рукамі электраправодку, электрапрыборы і разеткі.

**Уводная частка:**

Добры дзень! Сёння мы пазнаёмім вас са зброяй, ваенным начыннем і прадметамі быту ўдельнікаў Першай сусветнай вайны ў нашым краі.

Мне будуць дапамагаць экскурсаводы нашага музея, навучэнцы аб’яднання па інтарэсах «Музеязнаўства».

Пытанні да ўдзельнікаў экскурсіі:

- Што вам вядома пра Першую сусветную вайну?
- Назавіце асноўныя краіны-ўдзельніцы гэтай вайны?
- Як звязана тэрыторыя Беларусі з Першай сусветнай вайной?

У 2018 годзе споўнілася 100 гадоў пасля заканчэння Першай сусветнай вайны (1914 – 1918). У ёй прынялі ўдзел 33 дзяржавы і 5 калоній, у якіх жыло ¾ насельніцтва свету. У час гэтай вайны загінула каля 10 мільёнаў чалавек: гэта больш, чым за ўсе войны, якія вяліся на Зямлі ў папярэднія 1000 гадоў. На той час такога маштабнага і кравапралітнага канфлікта яшчэ не ведала чалавецтва.

У нашым краі ваявалі пехацінцы і кавалерысты, дзейнічала цяжкая артылерыя і авіяцыя, тут выкарыстоўвалі хімічную зброю, аэрастаты і іншыя сродкі для вядзення вайны. Мястэчка Лебедзева, як і іншыя населеныя пункты, размешчаныя на паўночным захадзе нашага раёна ў напрамку Смаргоні, у 1915 – 1916 гг. апынулася ў зоне актыўных баявых дзеянняў Заходняга фронту.

**Асноўная частка:**

**Экскурсавод 1:** У экспазіцыі школьнага гісторыка-краязнаўчага музея «Спадчына» знаходзяцца рэчы, якія з’яўляюцца сведкамі падзей Першай сусветнай вайны ў нашым краі (мал. 1, 2). Зброя, ваенны інструмент і асабістыя рэчы ўдзельнікаў вайны знойдзены ў ваколіцах Лебедзева і за яго межамі ў напрамку Смаргоні, там дзе праходзілі баі з удзелам рускіх і нямецкіх войск. Музей налічвае каля сарака экспанатаў. У час экскурсіі адбудзіцца знаёмства з іх гісторыяй.

Цікавасць уяўляе паштоўка 1914 года (мал. 3). Нягледзячы на тое, што іх было выдадзена шмат, сёння гэта вялікая рэдкасць, і знайсці іх можна толькі ў калекцыянераў. На пярэдняй старонцы паштоўкі мы бачым заклік «Ідзі за радзіму» і малюнак, на якім у чырвоным куце паказана маці на фоне партрэта імператара Мікалая ІІ. Яна праводзіць сына на вайну і вешае яму на шыю нацельны крыжык. Аўтар малюнка на паштоўцы – С. Радзівонаў. На адвароце паштоўкі зверху гаворыцца, што сродкі ад продажу паштоўкі пойдуць на дапамогу раненым і хворым воінам Вялікай Айчыннай вайны. У той час так называлі Першую сусветную вайну. Ніжэй размешчаны невялікі верш Мікалая Аляксеевіча Някрасава, які ён напісаў у 1855 годзе ў час Крымскай вайны (руска-турэцкая вайна 1853 – 1856 гг.). У ім аўтар сардэчна спачувае мацярам, чые сыны гінулі на гэтай вайне. Танальнасць верша: жахі вайны, яе ахвярнасць.

Внимая ужасам войны,
При каждой новой жертве боя
Мне жаль не друга, не жены,

Мне жаль не самого героя…
Увы! Утешится жена,
И друга лучший друг забудет;
Но где-то есть душа одна –
Она до гроба помнить будет!
Средь лицемерных наших дел
И всякой пошлости и прозы
Одни я в мире подсмотрел
Святые, искренние слёзы –
То слёзы бедных матерей!
Им не забыть своих детей,
Погибших на кровавой ниве,
Как не поднять плакучей иве
Своих поникнувших ветвей…

**Экскурсавод 2:** Не менш цікавая гісторыя меднага катла, у якім рыхтавалі ежу салдаты фурштацкай роты 14-га грэнадзёрскага Грузінскага палка. Кацёл (1 П 6 ¼ Ф) зроблены ў 1887 годзе ў Санкт-Пецярбургу на прадпрыемстве заводчыка Рыўцова (мал. 4). У камплекце з катлом было і спецыяльнае прыстасаванне для таго, каб даставаць з катла прыгатаванае мяса. Ваенныя называлі кацёл «мужам», а прыстасаванне «жонкай». Гэта «сямейная пара» амаль на сто год была разлучана. Кацёл («муж») знаходзіўся ў аднаго з гаспадароў Лебедзева Нехвядовіча Леаніда, які выкарыстоўваў яго як ёмкасць для захоўвання сыпучых прадуктаў. У той жа час прыстасаваннем для катла («жонкай») валодала жыхарка вёскі Кавальцы Шаюк Фёкла Давідаўна. Яна выкарыстоўвала гэта прыстасаванне ў якасці звычайнай качаргі.

Патрэбна адзначыць, што Фёкла Давідаўна доўгі час захоўвала і рэліквію фурштацкай роты 14-га грэнадзёрскага Грузінскага палка – «Палкавы абраз» (мал. 5). Калі ў 1989-м годзе была адноўлена дзейнасць лебедзеўскай Свята-Троіцкай царквы, яе пляменніца Вольга Якаўлеўна Матусевіч перадала абраз храму. Гісторыю вайсковага падраздзялення, які валодаў «Палкавым абразам», мы даследавалі раней. Але да цяперашняга часу нам не быў вядомы аўтар абраза. Пошукі намі працягваліся. Зусім нядаўна нам удалося рашыць гэту задачу. Дапамагло кляймо на абразе «АП НД 1840 84 (герб)». Названы абраз – гэта не толькі мастацкая каштоўнасць, але і ювелірны выраб высокай якасці. ПА – гэта ініцыялы маскоўскага майстра сярэбраных спраў Аляксандра Панфілава. Займаўся ён сваёй справай з 1823 па 1840 год. Аляксандар Панфілаў таксама вырабіў абразы «Господь Вседержитель» и «Святая мученица Александра». НД – гэта ініцыялы Дубровіна Мікалая Лукіча, прабірнага майстара. Займаўся ён сваёй дзейнасцю з 1822 па 1855 год. Памёр Мікалай Лукіч у 1862 годзе. 1840 год – гэта час клеймавання абраза. Лічба 84 азначае пробу серабра: у сплаве 84 долі серабра і 12 долей медзі.

**Экскурсавод 3:** Цікаўнасць уяўляе мельхіоравы Георгіеўскі крыж чацвёртай ступені (мал. 6). Знойдзены ён каля вёскі Маркава. Па воінскім статуце гэтай узнагародай адзначаліся ніжэйшыя чыны і афіцэры за адвагу на полі бою. Крыж зроблены ў 1917 годзе. У той час гэтыя ўзнагароды чаканілі з некаштоўных металаў, бо не хапала золата і срэбра. Тады рашэнне аб узнагароджанні Георгіеўскім крыжом прымалася на сходзе асабістага складу воінскага падраздзялення шляхам галасавання. Для прыняцця станоўчага рашэння прэтэндэнту патрэбна было набраць 2/3 галасоў.

Салдацкая сярэбраная іконка. Яе выдавалі як салдатам, так і афіцэрам ў 1914 – 1917 гг. у час царкоўнай службы ў храме (мал. 7).

Раменныя спражкі расійскіх салдат розных родаў войск і эмблема расійскіх штурмавых батальёнаў (мал. 8, 9). Гэтыя рэчы – доказ таго, што ў нашым краі ваявалі шматлікія расійскія воінскія падраздзяленні. У тым ліку і элітныя. Раданачальнікам стварэння рускіх штурмавых каманд быў генерал П.А.Плеве. Першыя такія воінскія фарміраванні з’явіліся ў кастрычніку 1915 года. Ударныя (штурмавыя) альбо батальёны «смерці», лічыліся своеасаблівым сімвалам баявога поспеху і вернасці Радзіме. Ініцыятарам ударных франтавых часцей новага тыпу быў генерал А.А.Брусілаў.

**Экскурсавод 4:** Салдацкі кінжал «Бебут» (крывы кінжал) быў прыняты на ўзбраенне Рускай імператарскай арміі ў 1907 годзе загадам № 287 па Ваенным ведамстве. Яго вытворчасць была налажана на Залатавустаўскай зброевай фабрыцы (мал. 10). Кінжал «Бебут» замяняў шашку ў тых выпадках, калі яе выкарыстанне было нязручным на абмежаванай прасторы. У той жа час даўжыня кінжала дазваляла ўпэўнена секчы ворага, а малая крывізна не перашкаджала ім калоць. У экстрэмальнай сітуацыі сіметрычнасць рукаяткі клінка рабіла яго зручным для выкарыстання. Аналіз фотаздымкаў таго часу дазваляе лічыць, што гэтую халодную зброю выкарыстоўвалі ў розных родах войск.

Фрагмент шыльды рускай паходнай кухні, разбуранай выбухам нямецкага снарада, – сведка бязлітасных баёў у нашым краі (мал. 11).

Нямецкі штык-нож «Бучар» (мал. 12). Яго ў першую чаргу выкарыстоўвалі сапёры. Выраблялся ён у горадзе Залінген. Гэта горад у Германіі, які мае даўнія традыцыі вырабу халоднай зброі. Слова «Бучар» мае розныя пераклады і абазначэнні: «мяснік», «кілер», «забойца» і іншыя.

Перанасны стальны шчыт нямецкіх штурмавых груп. Яго вага складае 15 кг. Разглядаючы фотаздымкі акопнага быту расійскіх салдат, мы можам убачыць на іх гэтыя шчыты. Нямецкія трафеі аберагалі ад куль і асколкаў снарадаў таксама расійскіх салдат і афіцэраў (мал. 13).

Нямецкі стальны шлем (Stahlhelm, мадэль М – 16), які з 1916 года паступова пачаў замяняць пікельхельм (шлем з пікай) (мал. 13).

**Экскурсавод 5:** Латунная кукарда ў выглядзе выявы вялікага прускага арла (герб Прусіі), якая была прымацавана на пікельхельме – нямецкім востраканцовым скураным шлеме ўзору 1842 года (мал. 14). Яна знойдзена на месцы былых акопаў непадалёк ад вёскі Крэва.

Суконныя пагоны радавога салдата аднаго з нямецкіх воінскіх падраздзяленняў 16-й Ландвернай дывізіі (мал. 15). Нягледзячы на тое, што пагоны амаль сто год праляжалі ў зямлі, яны маюць нядрэнны выгляд. Знаёмячыся з гісторыяй гэтай дывізіі, мы высветлілі, што яна была зборнай і складалася з тых, хто раней быў у запасе. Яе салдаты былі прызваны на вайну ў час другой хвалі мабілізацыі. Гэта дывізія дыслацыравалася ў Крэўскім замку, і менавіта яна ў многім павінна ў разбурэнні гэтага важнага для нас гістарычнага аб'екта.

Сярод знойдзеных прадметаў, якія належалі ўдзельнікам вайны, не толькі зброя: ёсць рэчы побыту і асабістага карыстання. З канца 1916 года ў салдат было больш вольнага часу, бо пачалася пазіцыйная («акопная») вайна [9]. Многія бавілі час, вырабляючы з падручных матэрыялаў карысныя для сябе рэчы.

Медны ножык – акопная творчасць германскіх салдат (мал. 16). Зроблены ён з меднага паяска снарада буйнага калібру. Выкарыстоўвалі яго для рэзкі паперы альбо мягкіх матэрыялаў.

Бутэлька з-пад адэкалону вядомай нямецкай фірмы «Georg Dralle» (Gamburg). Гэта парфумная фабрыка, якая заснавана ў 1843 годзе ў Гамбургу. У час вайны яна пастаўляла на фронт парфумерыю для салдат і афіцэраў (мал. 17).

Банка з-пад гуталіну фірмы «Nigrin» і шчотка для чысткі абутку. На этыкетцы банкі добра захаваліся малюнак і надпісы (мал. 18).

Патрэбна звярнуць увагу на матэрыял посуду нямецкіх і расійскіх салдат. Германцы, у асноўным, мелі эмаліраваны і мельхіоравы посуд, расійцы – медны і алюміневы. Рускія біклажкі для вады былі шклянымі, яны ў палявых умовах вельмі часта разбіваліся.

**Заключая частка:**

Для замацавання атрыманых ведаў папрашу адказаць на некалькі пытанняў:

1. Калі пачалася і закончылася Першая сусветная вайна?
2. Якія ахвяры мела Першая сусветная вайна?
3. На ваш погляд, якія экспанаты музея найбольш цікавыя і каштоўныя? Чаму?

*Пытанні наведвальнікаў музея да экскурсаводаў.*

Кожны экспанат гісторыка-краязнаўчага музея «Спадчына» мае сваю гісторыю. Яна змяшчае ў сабе лёсы вельмі многіх людзей, якія сутыкнуліся на полі бітвы. На жаль, іх дзейнасць не стварала нічога карыснага, а наадварот, вельмі часта несла смерць і разбурэнні. Карысным было б, каб гэтыя сродкі, патрачаныя на вайну, былі выкарастаны ў мірных мэтах.

Ці спадабалася вам наша экскурсія?

Запрашаем вас наведаць яшчэ раз наш музей з вашымі сябрамі. Да новых сустрэч!